

## Сухенка Алена Сямёнаўна

Нарадзілася ў 1934г. ў горадзе Унеча Бранскай вобласці. Пасля арышту бацькі як ворага народа пераехала ў 1936г. ў Гомельскую вобласць, у вайсковую частку Мышанка, дзе ў 1945г. і скончыла першы клас.

З 1948г. ў Барысаве, пасля сямі класаў школы №8 паступіла ў Барысаўскае педвучылішча, якое скончыла ў 1954г.

З першага верасня 1954 года прызначана настаўніцай пачатковых класаў школы №13.

З 1957 па 1960гг. працавала ў Брэсцкай вобласці, у Пружанах. Пасля заканчэння Мінскага педінстытута працягвала працаваць настаўніцай пачатковых класаў і настаўніцай беларускай мовы школы №13.



З 1973г. працавала метадыстам пачатковых класаў, а з 1974 г. загадчыцай методкабінета.

З 1973г. працавала старшынёй гаркама прафсаюза работнікаў адукацыі, спачатку на грамадскіх пачатках, а з 1977г. была выбрана старшынёй гаркама прафсаюза.

За час сваёй працы старшынёй гаркама шмат увагі надавала арганізацыі працы ўстаноў аддзела. Дапамагала з уладкаваннем жыллёвага пытання, праводзіла работу па санаторным лячэнні, уладкаванні дзяцей педагогаў у дзіцячыя сады.



Шмат ладзілася спаборніцтваў сярод педагогаў, цікава праводзіліся дні адпачынку для сем 'яў педагогаў, выязджалі ў Дудзінку, Жыцькава. На вышыню была паднятая мастацкая самадзейнасць сярод калектываў устаноў.

Скончыла сваю педагагічную дзейнасць загадчыцай школьным аддзяленнем Барысаўскага каледжа.